**СІНКРЭТЫЗМ ДАДАНЫХ ЧЛЕНАЎ СКАЗА** (грэч. *synkretismos* ‘спалучэнне, аб’яднанне’) у сістэме даданых членаў сказа – граматычнае паняцце, якое абазначае здольнасць пэўнага кампанента сумяшчаць у сабе прыметы розных членаў сказа.

Асноўныя прычыны сінкрэтызму:

1) спосаб выражэння кампанента сказа (як вядома, члены сказа могуць быць марфалагізаваныя і немарфалагізаваныя) (гл. **ЧЛЕН СКАЗА**);
2) сінтаксічная сувязь кампанента сказа (можа быць звязаны адначасова з некалькімі членамі сказа);
3) семантыка кампанента сказа (член сказа можа мець адразу некалькі значэнняў).

Сінкрэтызм уласцівы для:

**дапаўненняў**; яны з’яўляюцца:

1) азначальнымі (калі сумяшчаюць семантыку дапаўнення і азначэння): *Там, думалася, я знайду ўсе адказы на пытанні…* (Я. Колас); *Зноў паплылі ўспаміны пра роднае Палессе, пра маці, пра Ірыну* (Б. Сачанка);
2) акалічнаснымі (калі сумяшчаюць семантыку дапаўнення і акалічнасці): *Іваноўскі знарок як мага радзей пазіраў на гадзіннік…* (В. Быкаў);

**акалічнасцей**; яны могуць быць:

1) з аб’ектным адценнем: *Аўтобус лёгка імчаў па шашы* (Я. Сіпакоў); *Прачнуўся ён [афіцэр] ад страшэннай страляніны* (Я. Сіпакоў);
2) з азначальным адценнем: *Усе чакалі паездкі да мора; Запуск спадарожніка на арбіту быў прызначаны на раніцу*;

**азначэнняў;** яны могуць быць:

1) з аб’ектным адценнем: *Не надта любіць ён [Янка Брыль] фатаграфавацца, але ўгаварыць яго можна заўсёды, калі фонам для здымка выбераш жыта…* (У. Калеснік);
2) з акалічнасным адценнем: *Лес узімку таксама прыгожы, вабны* (Б. Сачанка); *Фронт у тое першае ваеннае лета перайшоў цераз гэтыя мясціны хутка* (В. Быкаў); *Смала з хвой цякала кроплямі.*

Пры вызначэнні члена сказа трэба правільна ўстанавіць, якое са значэнняў (аб’ектнае ці азначальнае, аб’ектнае ці акалічнаснае і г. д.) пераважае.

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ